ДЗЕНЬ УСЕНАРОДНАЙ ПАМЯЦІ АХВЯР ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І ГЕНАЦЫДУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

# МЫ ПОМНІМ

***22 чэрвеня 1941 года – адна з журботных дат нашай гісторыі. Менавіта ў гэты дзень пачалася самая кравапралітная вайна XX стагоддзя. У Беларусі загінуў кожны трэці. Звыш 216 спаленых дашчэнту вёсак не адноўлены да сённяшняга часу. Калі казаць пра наш рэгіён, то ў гарадах і сёлах Віцебшчыны загінулі 151 421 чалавек, амаль 69 тысяч былі сагнаныя ў рабства, а амаль 93 тысячы знішчаны ў лагерах для ваенапалонных. Памятаць пра гэта абавязаны кожны, бо пакуль мы помнім, мы жывём.***



У Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа па ўсёй рэспубліцы прайшла Усебеларуская хвіліна маўчання. Кожны ў 12 гадзін мог спыніцца на хвіліну і ўспомніць тых, хто выканаў абавязак па абароне Радзімы і цаной свайго жыцця зрабіў унёсак у Вялікую Перамогу, усіх загінулых, закатаваных у фашысцкай няволі, тых, хто памёр ад голаду і нягод у тыле.

А выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты ВДУ імя П.М. Машэрава ў гэты дзень сабраліся каля помніка выкладчыкам і студэнтам, якія загінулі за Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Да прысутных звярнуўся першы прарэктар ВДУ Андрэй Мехавіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, які адзначыў, што памяць пра ўсіх загінулых будзе заўсёды жыць у нашых сэрцах. Машэраўцы ўсклалі кветкі да помніка і хвілінай маўчання аддалі даніну павагі тым, хто не вярнуўся з той вайны.

Да таго ж студэнты розных факультэтаў ВДУ далучыліся да гісторыка-патрыятычнага марафона памяці «Пакуль мы помнім – яны жывуць» і наведалі памятныя месцы Віцебска, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, а студэнты ФСПіП у сацыяльнай сетцы «Інстаграм» размясцілі відэаролікі з чытанннем вершаў класікаў пра вайну.

**Фотаздымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота- і відэарэпартаж з мітынгу глядзіце з дапамогай QR-кода.

